Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem.

# З[illegible] ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Па[illegible] з дастаўкай да хаты 1 з[illegible] на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 7 Вільня, Субота 23-га чэрвеня 1928 г. Год 1



## З надыходам новага школьнага году.

Працоўныя масы Зах. Беларусі, змагаючыся за свае правы, правы кожнага чалавека, прымусілі зьвярнуць на сябе ўвагу ўсіх працоўных розных нацыянальнасьцяў.

У выніку гэтага аграмаднага ўздыму можам сканстантаваць: *магутны ўзрост клясавай сьвядомасьці беларускага працоўнага народу, зразуменьне свайго палажэньня і*, што нажаль прымушаны сьцьвердзіць, *утрату працоўнай інтэлігенцыі, правадыроў народу*, ці то шляхам прымусовага выезду заграніцу (вучыцялі і некаторыя матурысты), ці адыходам на „лёгкі хлеб“, за... краты.

Такім чынам беларускі працоўны народ застаўся, амаль што зусім, *пазбаўлены тых людзей, якія прышчапілі тую сьвядомасьць* і гэтым самым *затрымліваецца вызваленчы рух*!

Але ня ўсё яшчэ страчана. Адабрана правадыроў, але *немагчыма ніякімі сіламі выдзерці тое, што правадыры гэныя далі народу*, іменна тую *клясавую сьвядомасьць*, зразуменьне патрэбы барацьбы за зямлю, за родную школу, за палітычныя правы.

І вось, дзякуючы сваёй сьвядомасьці, аб якой сьведчаць розныя арганізацыі, як былая Грамада, Т-ва Бел. Школы, працоўны народ *дасьць тое*, што ў яго забралі, г. зн. *працоўную беларускую інтэлігэнцыю*. Народ сваімі высілкамі, сваёй арганізацыяй, праз свае беларускія гімназіі выгадуе правадыроў, без якіх *немагчыма вызваленьне* з той цемры і сацыяльнага палажэньня, у якім наш народ знаходзіцца.

*Будучы, 1928-29 школьны год мусіць быць годам масавага, арганізаванага наплыву сялянскіх дзяцей ў тыя адвіныя чатыры беларускія гімназіі.*

На чале ўсёй гэтай акцыі павінны стаць Гурткі і сябры Т-ва Бел. Школы, як арганізацыі самыя большыя і самыя актыўныя.

Не адкладаючы справы, гурткі мусяць зараз-жа ўзяцца за працу. У сваёй ці суседняй вёсцы выбраць самага здольнага вучня, падгатаваць яго, забясьпечыць яму утрыманьне ў гімназіі, ставячы на гэтую мэту спэктаклі, ладзячы рэфэраты, зьбіраньне ахвяр, словам, усе магчымыя способы, якія цяжка наперад прадбачыць.

Аб прабегу ўсёй акцыі пісаць у газэту.

Кожны барацьбіт за працоўны народ, кожны селянін, павінен памятаць, што *толькі шляхам арганізацыі, шляхам гуртаваньня, злучэньня нашых сіл*, можа здольнае дзіця малазямельнага, ці бяззямельнага, *дабрацца да асьветы, да гімназіі*; дзіця-ж, *высланае арганізацыяй* будзе заўсёды памятаць, што яно пайшло вучыцца, *дзякуючы грамадзе беднякоў*, якой дзеля гэтага, *яно аддасьць усе свае сілы, усе здольнасьці, сваю навуку*; *з такога вучня будзе працоўны інтэлігэнт, правадыр паняволеных мас*!

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўнае ей існаваньне.

## Ці—„ухходняе Лёкарно“ за скасаваньне акупацыі Надрэніі?

Вяртаючыся з Жэнэвы дамоў, польскі міністар Залескі сказаў на ўрачыстым банкеце ў Парыжы вялікую палітычную прамову, якая здолела зацікавіць, калі не ўсхваляваць, усю эўрапэйскую прэсу, асабліва,—ведама-ж—нямецкую.

Газэты не падалі яшчэ дакладна тэксту гэтай прамовы, але галоўны яе зьмест дадзены ў тэлеграмах.

„Міністар Залескі заявіў, што жывіць намеры перагляду трактатаў, гэта значыць над збурэньнем усяго гмаху міру. Справа міру і бясьпечнасьці мае такое вялізарнае значэньне для Францыі, як і для Польшчы, што Польшча ня можа быць раўнадушна ў справе адмовы (!?) ад існуючых гарантыяў бясьпечнасьці, не атрымаўшы ўзамену іх раўнаважных ім іншых, а дзеля таго перадусім найгарачэйшым жаданьнем Польшчы ёсьць утрыманьне ды паглыбленьне саюзу з Францыяй“.

Так даносіць — усьлед за францускім афіцыяльным агенствам—польскае.

Водгукі францускае прэсы высьвятляюць ясна, аб што тутака ідзе.

Нарады польскага міністра з францускімі і яго прамова — стаяць у сувязі з тым, што Нямеччына пастанавіла рубам паставіць на верасьнёвай сэсыі Рады і агульнага збору Лігі Нацыяў справу скасаваньня акупацыі сваей зямлі саюзьнікамі.

Пэўне ж, нямецкая дыплёматыя добра падгатавала ўсёбакова—сваю акцыю ў гэтай справе.

„Дык вось, кажа адна з францускіх газэтаў, польскі міністар пачуў сваім абавязкам зьвярнуць увагу францускіх палітычных колаў—з аднаго боку, на ўнушаючае трывогі непрымірымае становішча Літвы, а, з другога,—на насьледствы, якія можа выклікаць у цэнтральнай Эўропе скасаваньне ваеннай акупацыі Надрэніі, зробленае без суадказнай гарантыі — ня толькі на Захадзе, але і на Усходзе“.

Трэба прызнаць, што польскі дыплёмат вельмі спрытна зьвязаў літоўскую справу з нямецкай, каб лепш пастрашыць Эўропу нямецкай небясьпекай, якую навет сама Францыя неяк пачынае „лёгкаважыць“... — Аб гэтым ясна сьведчыць цытаваная тым-жа „ПАТ“ другая француская газэта, баявы орган францускіх нацыянал-мілітарыстаў.—Яна кажа, што—„ніякая фінансавая камбінацыя (?!) не заступіць тэй гарантыі, якую дае ваенная акупацыя нямецкай зямлі“. Дык радзіць „прыяцялям-палякам, каб не далі сябе ашукаць рознымі абяцанкамі падобнага (?) роду“.—Палякі павінны энэргічна бараніць свае правы, а тым самым ахаваць і Францыю, якая—сваей уступлівасьцяй — наражае сябе на небясьпеку“...

Мы памятаем нядаўную вострую палеміку паміж самім Пуанкарэ і поруч з яго сацыялістычным аружаносцам тав. Полем Бонкурам, з аднаго боку, і мін. Штрэзэманам, з другога,—у справе „заплаты“ з боку Нямеччыны на карысьць Францыі за скасаваньне акупацыі. Францускія дзяржаўнікі трэбавалі ад Нямеччыны—ня толькі „дадатковых гарартыяў“, але—і дадатковых фінансава-гаспадарчых карысьцяў—за скасаваньне акупацыі, калі-б навет самі прызналі, што Нямеччына споўніла ўсе прадбачаныя трактатам варункі. Нямецкая прэса тады, а навет сам Штрэзэман — востра пратэставалі проці такога нячуванага нарушэньня трактату.

Запраўды-ж 12-ты аддзел Вэрсальскага Трактату—§§ 428-432 — арт. 428 ясна кажа, што „ваенная акупацыя нямецкай зямлі войскамі саюзьнікаў мае мэтай — загарантаваць ім выкананьне з боку Нямеччыны міравога трактату“. Арт. 431 дадае няменш ясна і катэгарычна, што—„акупацыйныя войскі павінны быць безадкладна выведзены навет раней 15-гадовага тэрміну, калі Нямеччына яшчэ—перад канцом тэрміна — споўніць усе свае забавязаньні, выплываючыя з Вэрс. Трактату“.

Дык праўнае пытаньне — толькі ў тым, ці споўніла Нямеччына ўсе свае трактатавыя абавязкі.

Ведама, што вялізарную частку трактатавых абавязкаў выканалі за Нямеччыну — самі саюзьнікі, якія проста змусілі да гэтага пераможаную дзяржаву дый самі ўзялі сабе ад яе ўсё тое, што „прысудзілі“ сабе ад яе ў Трактаце.

Абавязак разбраеньня—афіцыяльна прызнаны ўжо саюзьнікам выкананым цалком. Астаецца—абавязак адшкадаваньняў.

Так-званы „Пляв Доўса“ неяк аддзяліў гэты абавязак Нямеччыны ад Трактату (фактычны перагляд Трактату...), улажыўшы яго ў асобную ўмову з саюзьнікамі, падпісаную ўжо дабраволына Нямеччынай (не раўнуючы да вымушанага яе падпісу пад Трактатам). Амэрыканская дыплёматыя побач з нямецкай, як ведама, апрацавалі нядаўна новы плян, каб гэты абавязак адшкадаваньняў перарабіць на звычайныя дзяржаўныя даўгі Нямеччыны паасобным саюзьнікам, выдзяліўшы такім чынам гэтыя фінансавыя абавязкі Нямеччыны ўжо цалком з Вэрсальскага Трактату.

Што тады астаецца яшчэ споўніць Нямеччыне з усіх варункаў Трактату?

Праўна—нічога! Дык акупацыя павінна быць скасавана! Праўна беспадстаўная, маральна агідная, асабліва пасьля „Лёкарно“, акупацыя аднак-жа дае пакуль што фактычную сілу Францыі над Нямеччынай, якую першая ня хоча „задарма“ выпускаць з рук. Адсюль дамаганьне розных фінансава-гаспадарчых кампэнсацыяў, якое нямецкая прэса, можа, завостра, называе „азброеным шантажам“...

Трэба ўспомніць датаго-ж, што яшчэ нядаўна з францускага боку высоўваліся яшчэ і іншага зьместу дамаганьні. Сам маршал Фош у публічных заявах „тлумачыў“ сэнс ваеннай акупацыі Надрэніі так, што яна мае—„паводле духу Трактату“—ня толькі загарантаваць спаўненьне Нямеччынай усіх варункаў Трактату, але яшчэ і... даць час акрэпнуць і ўмацавацца ўсебакова ўсім тым новастворанным у выніку міру дзяржавам, якія ў Нямеччыне маюць свайго натуральнага ворага, а ў асобе Францыі—свайго натуральнага прыяцеля і ўзаемна ахоўваючага кожную з іх—саюзьніка...

Так „пашыраюча“ тлумачучы трактат ген. Фош даводзіў, што трактат дае „права прадоўжыць акупацыю і далей прадбачанага ў трактаце тэрміну, калі Нямеччына будзе ўсьцяж „унушаць падазрэньні адносна да сваей ляяльнасьці“ і г. д. Яшчэ зусім нядаўна вельмі блізкі да гэтага пагляд разьвіваў сам Пуанкарэ ў адной з сваіх прамоваў, палямізуючых з Штрэзэманам, але, відаць—ужо толькі страшучы Нямеччыну, каб націснуць на яе ўрад—у напрамку вымаганых францускім урадам „кампэнсацыяў“—фінансавых і іншых.

Па сутнасьці-ж, шчыра верыць у выканальнасьць такога ўтрыманьня акупацыі навет да 15-гадовага тэрміну, трэба думаць, ужо мала хто ў-ва Францыі з адказна мысьлячых палітыкаў. Цяпер пагляд гэты—жыве, як неастыўшы яшчэ ад часу вайны „апэтыт да мяса нямецкага быка“, паводле трафнага слова Лёйд-Джорджа — толькі можа ў найбольш няпрымірымых францускіх мілітарыстаў...

На дзеле-ж, як відаць з прыведзеных вышэй тэлеграмаў, францускі ўрад ужо дагаварыўся з нямецкім у справе фінансавых і іншых гарантыяў і кампэнсацыяў—за скасаваньне акупацыі. Гэта так страшэнна і занепакоіла лягер гэтых крайніх францускіх мілітарыстаў, што іх орган у адчаі кліча „прыяцеляў - палякаў... бараніць Францыю“ ад яе ўраду,—ад небясьпекі, якой пагражае Францыі яго залішняя ўступлівасьць на карысьць немцаў...

(Канец будзе).

## Працаўнікі Белар. Устаноў.

**Ці зрабілі Вы пастанову аб тым, каб вылічаць пэўны працэнт ад вашага месячнага заробку на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні“. Калі не, то ведайце, што ўжо найвышэйшы час зрабіць такую пастанову.**

**Лічба 17—гэта нумар конта (рахунак) „Дому Беларускай Культуры ў Вільні“ ў Беларускім Каапэратыўным Банку ў Вільні. Ці паслалі Вы хоць што-небудзь на гэтае конта. Ці выпаўнілі свой грамадзкі абавязак. Калі не, то зараз-жа пашліце, грамадзянін.**

**Помніце, што Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні пачало зьбіраць ахвяры на пабудову „Дому Беларускае Культуры“ ў Вільні. Памятайце, што кожны беларус мусіць ахвяраваць штонебудзь на гэтую сьвятую справу. Ахвяры сьніроўваць на адрас: Wilno, ul. Wileńska 8. Białoruski Kooperatywny Bank konto Nr. 17.**

## „Кольмар і Вільня“.

(„Robotnik“—аб працэсе „Грамады“).

Пад такім загалоўкам зьмяшчае перадавіцу „Работнік“, у якой параўноўвае працэс эльзаскіх аўтанамістаў у Кольмары з працэсам грамадаўцаў у Вільні. Беларуская прэса—у сваіх аглядах заграмічнага жыцьця — даўно ўжо зрабіла гэтае параўнаньне, знаходзячы супольныя прычыны ў трагэдыі такіх мяшаных, парэзаных, знаходзячыхся між двух магутных дзяржаваў, краёў....

„Работнік“ падчырквае, што эльзаскія аўтанамісты, ці незалежнікі, якія таксама вінаваціліся пракуратурай у імкненьні да адарваньня краю ад Францыі, засуджаны францускім судом без параўнаньня лягчэй, як беларускія.

„У кольмарскім працэсе засуджаны 4 падсудных, у тым ліку 2 паслоў, на 1 год вастрогу кожны; рэшта — апраўдана, тады як у Вільні засуджана 37 падсудных з агульнай лічбы 56 — у агульнай лічбе на 209 гадоў цяжкага вастрогу!—у тым ліку 4 паслоў, па 12 гадоў кожнага“...

„Работнік“, праводзячы (даволі сумбурна) паралелю паміж „эльзаскімі грамадаўцамі“ і „беларускімі эльзасцамі“, кажа, што апошнія—наадварот — маюць значна больш „лагодзячых абставінаў“, каб атрымаць значна больш лагодны прысуд, як іх заходнія калегі. „Эльзаскія грамадзісты“ папалі ў край, дзе ім зусім нягорш, чым у Нямеччыне, да якой толькі цягне краёвых немцаў іх сувязь і лучнасьць з нямецкай культурай.

У нас „польскія беларусы“ апынуліся паміж Польшчай і Радавай Беларусяй. — „Справядлівасьць кажа прызнаць, піша газэта, што ў Радавай Беларусі культурна нацыянальнае разьвіцьцё не спатыкае з боку Масквы перашкодаў; беларускае насяленьне за кардонам з запалам працуе над роднай культурай, паступова падрыхтоўваючыся ды ўзгадоўваючыся да самастойнага жыцьця. У нас-жа крэсовая адміністрацыя, апіраючыся на каротказрочнасьць ды безпраграмнасьць цэнтральных уладаў, душыць ды пераследуе часам („nieraz“... Ах, пане Недзялкоўскі!) культурна-нацыянальны рух беларусаў—на вялікую пацеху Масквы і яе агентаў. Якжа можна—у такіх варунках—трэбаваць ад беларускага насяленьня, каб яно ў працягу 7 гадоў прыналежнасьці да Польшчы разьвіла ў сябе польскі патрыятызм?! Хто з чыстым сумленьнем можа трэбаваць ад яго прывязанасьці да польскай дзяржаўнасьці?!

Беларусы, як кожны народ, пазбаўлены вольнасьці, імкнуцца да аб'яднаньня сваей Бацькаўшчыны—у адзіную незалежную дзяржаву, дык з гэтага пункту гледжаньня ня маюць падставаў жывіць вялікшую сымпатыю да Расеі, як да Польшчы.

Чым-жа-ж зьяўляецца „Грамада“ і яе дзеяльнасьць, як не арганізованым нездаволеньнем беларускага насяленьня. Калі б навет было праўдай, што „абвінавачаныя ў працэсе Грамады былі на ўслугах Масквы“, — дык і тагды — „ці-ж беларускія масы так ужо зьвернуць на гэта ўвагу? Ці — хутчэй — гэтыя 209 гадоў цяжкага вастрогу не закрыюць ад іх праступленьне дзяржаўнай здрады абвінавачаных, дый — наадварот ня стануць для іх пашпартам на званьне нацыянальных мучальнікаў беларускага народу“...

„Кольмар і Вільня“!, канчае „Роботнік“.— Розьніца абодвух працэсаў прамаўляе хутчэй на карысьць беларусаў, а, ня гледзячы на гэта — якая страшэнная розьніца ў прысудах — на крыўду беларусаў! Але — трэба ведаць, што навет кольмарскі прысуд выклікаў заграніцай, напрыклад, у англійскай публічнай апініі, крытычныя ды няпрыхільныя для Францыі галасы. Чаму? А таму, што — у паваенныя часы апінія культурных краёў — вельмі уражлівая ды дражлівая ў стасунку да справаў нацыянальных меншасьцяў. Пануе там пагляд, што, калі вайна не давяла да канчальнага вырашэньня задачаў нацыянальнай самастойнасьці ўсіх народаў, дык трэба ўчыніць усё магчымае, каб ухіляць ад дражненьняў ды завастрэньняў у гэтай галіне, асабліва ж з пагляду на тое, што новыя варункі жыцьця ўсьцяж яшчэ такія няўсталеныя ды хаотычныя, што Віленскі прысуд прыняты заграніцай з найвышэйшым зьдзіўленьнем („zdumieniem“), а навет— з жахам („przerażeniem“), гэтага ня трэба тлумачыць“. Прысуд гэты, кажа ў заканчэньні „Роботнік“, ёсьць вялікай палітычнай памылкай, якую трэба направіць. Падаем гэтыя словы „Robotnika“ без дадаткаў.

# Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

### Прамова адв. Бабянскага.

Частка людНасьці, паходзячая з гэтае зямлі, сядзіць на лаве абвінавачаных. Чаму здарылася гэткая трагэдыя? Па абвяшчэньню незалежнасьці Беларусі 25.III 1918 г., у беларускім грамадзенстве былі розныя арыентацыі. Але ў 1919 г., па выданьню адозвы „Naczelnego Wodza“ паўстала амаль што аднапітая арыентацыя на Польшчу. Беларускія дзеячы вяртаюцца з Менска. Луцкевіч едзе ў Парыж. 1920 год разьбівае ўсе надзеі беларускіх патрыётаў. Прыходзе рыжскі трактат, які перапаловіў Беларусь. Грабскі баяўся далучэньня ўсіх беларускіх земляў да Польшчы, бо яго праграме не адпавядала фэдэрацыя.

Няшчасьце беларускіх патрыётаў было вялікае. Наступае канфэрэнцыя ў Празе, будзіцца думка аб паўстаньні, эпілёгам якой зьяўляецца рад працэсаў, у якіх я меў гонар браць учасьце разам з маім калегай Т. Урублеўскім. У 1922 г. беларускі народ высылае сваіх прадстаўнікоў у Сойм, якія падтрымліваюць урад Сікорскага, жадаючы нязначных культурна-прасьветных канцэсіяў. Тугутту, творачаму ўрад, Тарашкевіч абяцае сваю помач. Але надходзе цяжкі час урадаў Хіена Пяста, час шавінізму і дзікага нацыяналізму. Гэтыя ўрады робяць усё магчымае, каб спольшчыць і вынарадавіць беларусаў. Зьніштожана дашчэнтна беларускае школьніцтва, пазачынена ўсе школы. І навет, калі на падставе языковых законаў зложана дэкляр'ацыяў на 412 бел. школаў, адчынена толькі дзьве. Народную спружыстасьць прабавалі зьнішчыць. Тады, калі людНасьць была гаспадарча зьнішчана, стараліся яе вынарадавіць. Зачынаецца фэрмэнт, бо сьвядомасьць народная вельмі высокая. Тарашкевіч, беларус з ураджэньня, бедаваў над перапалоўленым народам, як яго прадстаўнік. У Сойме вядзе палітыку малёнафільскую, якая можа і не адпавядала імкненьням беларускага народу. Пераканаўшыся, што зьверху нічога не дадуць, Тарашкевіч зьвяртаецца да мас. Паны судзьдзі, ня гледзячы на мароз, правы вясны дамагаюцца свайго. Творыцца аднапітая арганізацыя, бо беларускае грамадзянства зьяўляецца аднапітай сялянскай масай. Паміж ёй і палякамі ёсьць пропасьць, запоўніць якую зьяўляецца нашым заданьнем. Трэба памятаць аб трагэдыі беларускае безработнае інтэлігенцыі, аб моладзі, якая туляецца па Празе, Бэрліне і Парыжы. Грамада бярэ свой пачатак у 1905 г. і існуе ўжо 25 гадоў з тэй самай праграмай. Беларускі селянін больш перацярпеў, перайшоў і перанёс, чым хто іншы. І дзеля гэтага знайшла водгук у яго сэрцы Грамада, са сваей шчырай і простай праграмай. Праграма гэта гавора больш аб пытаньнях культурна-асьветных і нацыянальных, чым аб палітычных. Да разьвіцьця-ж Грамады давяла наша шэрая рэальнасьць, шэрая патрэба, а не якісьці „Mistrz“ або „Szatan“. Што ж гэтай Грамадзе процістаўлена, што магло-б хоць крыху прытупіць яе вострасьць? Ці процістаўлена ёй самаўрады, духавенства, вучыцельства? Не, самаўрады не выяўлялі дзеяльнасьці, вучыцельства—гэта чужы ёй духоўна і культурна элемэнт. А апрача гэтага нічога, што-б магло проціставіцца Грамадзе, няма.

Есьць толькі сіла. Але гэта сродак няпэўны. Мы былі сьведкамі вялізарнае працы паліцыі, якая старалася даказаць антыдзяржаўную дзеяльнасьць Грамады. Паны судзьдзі, яшчэ не ўстаноўлена ў Польшчы паняцьце дзяржаўнасьці.

Колькі было ўрадаў, толькі і дзяржаўнасьцяў. Цяпер, пасьля мая, маем новую дзяржаўнасьць.

Але ў чым-жа выявілася антыдзяржаўная дзеяльнасьць Грамады? У сканфіскаванай літэратуры, якая не дайшла да мас?

Уся дзеяльнасьць Грамады была скірована процi існаваўшых адносінаў за часоў урадаў дзікага нацыяналізму. Ці можа Грамада адказваць за тое, што на яе абшары камуністычная партыя раскідвала сваю літэратуру. Ці-ж можна залічаць на рахунак Грамады факт выкарыстоўваньня яе Кампартыяй? У апошніх часох Грамада была для Кампартыі навет небясьпекай. Аб лучнасьці Грамады з КПЗБ ня можа быць навет мовы. Стараліся тут даказаць лучнасьць Тарашкевіча з КПЗБ, але гэта зусім ня ўдалося. Ды і гэтаму ніхто не паверыць, бо некалькі дэманстрацый гэта ня доказ.

Я не хачу, каб Грамада без яе волі была адпіхана на Усход. Трэба памятаць, што Польшча ня мае дэмакратыі. Польскую дэмакратыю створыць вясковая інтэлігенцыя. Гэта пытаньне вельмі важнае. Ці-ж можна казаць аб прадажнасьці Тарашкевіча, калі ён зьяўляецца ў жыцьці анахарэтам? Гэткага закіду, ня маючы доказаў, ставіць ня можна. Бо тое, што ён беларускі народ прадаў шатану, асталося ў сфэры абстракцыі і недаказаньне прыпушчэньняў. Тарашкевіч нікoлі не ламаў сваей прысягі. Барацьба, якую вёў, гэта барацьба за права, загарантаванае канстытуцыяй, гэта абарона сваіх правоў і інтарэсаў.

Суд мае перад сабой нячувана цяжкі абавязак. На лаве абвінавачаных—людзі, якія жывуць у гэтым краі ад сваіх прадзедаў, што пад праводніцтвам Вітальда йшлі над Грунвальд. Вы, паны судзьдзі, павінны сплаціць доўг гэтае зямлі, ўзяты ад яе. Гэта зямля выдала гігантаў духа, а перадусім Міцкевіча, які быў прыняты культурай яе. Гэты доўг удзячнасьці адносна беларускага народу мы павінны сплаціць.

### Прамова адв. Эттінгера.

Першай рэччу, якая кідаецца ў вочы пры чытаньні акту абвінавачаньня — гэта хаос у дзборы матэрыялаў. У адну кучу згонена ўсю Грамаду, доказы процi паасобных асоб, Камінтэра, Крэстынтэра і г. д. Такім спосабам створана можа пекны літэратурны твор, але ня акт абвінавачаньня.

Акт абвінавачаньня абняў не 56 чалавек, але ¼ мільёна людНасьці, аб якой нам ходзе.

Не пярэчу, што гэткім спосабам пракурор значна аблягчаў сваю задачу — знайсьці праступнікаў у ¼ мільёна людНасьці.

Але, калі ¼ мільёна людНасьці закідваецца антыкамасыйная і антыпадаткавая агітацыя — дык ня можна ссылацца на паказаньні аднаго солтыса. Гэты солтыс мае даказаць тое, што даказвае ў даным выпадку статыстыка. Пан пракурор, прызвычаіўшыся да дробных працэсаў, ня змог прыгатовіць вялікага працэсу.

Статыстычныя даныя Мін. Скарбу і Мін. Унтр. Спр., а ў справе дэзэрцыі М.С. Войск.— дaступны для пана пракурора. Дык чаму-ж нам гэтых нязьбітых доказаў не прадставіць? Відочна, пан пракурор згодзіўся з поглядам аднаго сьведкі з боку абвінавачаньня, які сказаў, што і ў Галоўным Статыстычным Урадзе ёсьць многа камуністаў.

Вось-жа, паводле майго пагляду, без статыстыкі ня можна ўстанаўляць віны абвінавачаных.

Тэхніка, якую мы бачылі, гэта тэхніка малога працэсу.

Што-ж далей зрабіў пан пракурор? Ідэі: самаазначэньне народаў, пацыфізм, раўнаўпраўненьне грамадзян,—гэта ўсё разам падцягнуў пад паняцьце камунізму.

Гэткае клясыфікацыі ня ўнікла і ідэя ўваскрашэньня беларускага народу. Гэткае скамунізаваньне найшляхэтнейшых лёзунгаў дэмакратыі ўсяго сьвету зьяўляецца аналёгіяй камунізму.

Апрача гэтага — яшчэ адна характэрнасьць акту абвінавачаньня: тэолёгічна-схалястычнае трактаваньне сабранага матэрыялу. Як тэолёг, розным апакрыфам, подісам на маргінэсах прыдае значэньне нязьбітых канонаў, дык гэтак сама, у гэтым акце абвінавачаньня, усякія пастановы, часопісі, сабраныя па другой старане, зьяўляюцца для п. пракурора абсалютна верагоднымі дакумантамі. Асабістыя нататкі Мордуха Бакшта для пракурора — рэчы сьвятыя і нятыкальныя. Але гэтага мала. П. пракурор у аналёгіі камунізму ідзе так далёка, што кожны факт, які здарыўся на нашай тэрыторыі, знаходзіць у яго свой адпаведнік у Радавай Расеі.

Атрымоўваецца ўражаньне, што каб у Польшчы было землятрасеньне, дык п. пракурор быў-бы гатоў прыпісаць гэта пастановам камінтэрну. І наагул п. пракурор апэруе выключна агульнікамі, „wielkimi mistrzami“, „szatanami“, не даючы ніякіх пераконваючых аргумэнтаў. Трымаецца ён напр. становішча, што бел. народны рух быў марыянэткай у руках праваднікоў Грамады. Скуль на гэта даныя? Кажа ён далей, што гурткі дамагаліся ліквідацыі асадніцтва, а ці гэтага ня было ў праграме Грамады? Ці пан пракурор аб гэтым ня ведаў? Дык што-ж з гэтага? Ці гэта праступак? Сцьверджана, што ў гуртках былі гутаркі аб незалежнасьці. Добра, але ж беларускае грамадзянства што год публічна абходзіць сьвята абвешчаньня Незалежнасьці Белар. і ніхто гэтага не забараняе.

У канцы, паводле акту абвінавачаньня, каронай ўсяго ёсьць прэса савецкая. Ці-ж можна аднак-жа лічыць за нязьбіты доказ усё, што напіша карэспандэнт камуністычны?

Урэшце п. пракурор даказвае, што паміма недахопу складаў аружжа, паўстанцы маглі лічыць на разаружэньне войска. Гэткім шляхам лягічнага разважаньня ані адзін Суд iсьці ня можа. Гэткая тэза пляміць польскую армію.

Канчаецца ўвесь элябарат абвінавачаньня 102 арт. К. К. Але гэта, здаецца, дзеля таго, што людзей, сідзячых на лаве абвінавачаных, за што іншае засудзіць ня можна. Вядомай рэччу ёсьць, што аб дзеяльнасьці арганізацыі рашае тактыка, а не праграма. На гэтым-жа становішчы стаіць і Найвышэйшы Суд. А тактыка Грамады была яўная і легальная і ня можна засуджаваць людзей, якія вядуць сваю дзеяльнасьць легальна.

Сваю прамову адв. Эттінгер скончыў гэткімі славамі: Некалькі гадоў назад аналягічны працэс адбываўся ў іншым славянскім краі. На лаве абвінавачаных засеў Сьцяпан Радзіч, праваднік Харватаў, якому закідвалася паразуменьне з Крэстінтэрнам. Прыгавар, апраўдаўшы падсудных у працэсе ў Заграбі, пагадзіў Сэрбаў з Харватамі. Я веру, што гэткі-ж прыгавар у цяперашнім працэсе будзе мостам да згоды паміж Беларусамі і Палякамі.

# Палітычная хроніка.

## У Польшчы.

### Дэманстрацыя безработных жалезнадарожнікаў перад Соймам.

13 г. чэрвеня перад будынкам Сойму адбылася дэманстрацыя безработных жалезнадарожнікаў. Дэманстрацыя, у ліку каля 200 чалавек, была затрымана перш маршалкоўскаю стражаю, а потым прыбыўшым аддзелам паліцыі. Затрыманая дэманстрацыя, вярнуўшыся ў вуліцу Матэйкі, выслала ў Сойм дэлегацыю. Дэлегацыю прыняў і адаслаў да адпаведнага Міністра Маршалак Дашынскі.

### Агульныя цыфры бюджэту.

Агульныя цыфры бюджэту, пасьля галасаваньня над ім, прадстаўляюцца наступна: Звычайныя выдаткі — 2,357,583,579. Надзвычайныя выдаткі — 146,318,450, разам 2,503,902,029 злотых.

У дзяржаўных прадпрыемствах звычайныя расходы — 1,444,985,413 злотых, надзвычайныя астаюцца бяз зьмены — 277,319,638.

Расходы ў дзяржаўных манаполях — 571,881,648, а надзвычайныя расходы ў гэтай галіне — 21,566,000 злотых.

### З соймавай праўнай камісіі.

Праўная соймавая камісія прыняла ўрадавы праект аб амністыі з вельмі малымі зьменамі.

Прапазіцыя пасла Гартгляса (жыд) аб замене кары сьмерці на 15 гадоў вастрогу і аб пашырэньні амністыі на дэзэртыраў і ўхіляўшыхся ад войска, адасланы ў падкамісію.

Досьць доўга пратрывала дыскусія над прапановай пасла Загайкевіча (укр.) і Гартгляса (жыд) аб выключэньні з амністыі ўрадоўцаў, надужываўшых улады, асабліва ў часе выбараў. Прысутны на паседжаньні віцэміністар справядлівасьці Цар заявіў, што ўрад на гэта ня згодзіцца(!).

### Узрост дарагоўлі ў Варшаве.

Камісія дзеля досьледаў (zbadania) коштаў пражыцьця ўсталіла, што ў параўнаньні з красавіком, жыцьцё ў траўні падаражэла на 0,5 прац.

Апрача ўзросту цаны спажывецкіх прадуктаў найбольш, аж на 3, 4 прац., падаражэў апал і асьвятленьне.

### Лік безработных у Варшаве.

Статыстыка падае, што ад 4 да 9 гэтага месяца лік безработных у Варшаве раўняўся 10.315 чалавек, з якіх 3.220 умысловых работнікаў.

### Надужыцьці ў скарбовай „Izbie“ ў Пазнані.

Міністар Скарбу звольніў са службы начальніка выдзелу 4 скарбовай „Izby“ ў Пазнані, Язэпа Вянка. Гэтае звальненьне ёсьць наступствам выяўленых скарбовых надужыцьцяў начальніка Вянка.

### Камуністы ў Петракове.

У Акружным Судзе ў Петракове пачаўся працэс 15 камуністаў. На працэс заклікана некалькі дзесяткаў сьведак.

# Воля і доля сялян-беднякоў.

### Сходка.

— Сыманюка! Шумілу! Саковіча!—хто ў свой голас—крычалі дальшыя. Земскі пашаптаўся з пісарам, даў знак, каб сціхлі і загаварыў.

— Есьць два кандыдаты—Дзяцел і Саковіч. Мне здаецца, што двох будзе досыць!

— Досыць! Досыць!—загудзелі пярэднія.

— Калі досыць, дык распачнём галасаваньне. Хто за старага старшыню—перахадзі направа, хто за Саковіча—улева!—скамандаваў земскі.

Для агулу Саковіч быў зусім нявядомы чалавек, і таму большасьць сялян стаяла ў нерашучасьці, ня ведаючы, што рабіць. Старшыновы хаўрусьнікі дружна рынуліся ўправа, цягнучы за сабой і частку нездаволеных. На левых Дзяцел злосна паглядаў і яго пагляд, здаецца, хацеў прабіць кожнага; некаторыя ня вытрымалі яго і чалавек дваццаць перайшло, спусьціўшы галовы, направа. Земскі з пісарам лічылі. На Дзятлавай старане аказалася 128 чалавек, за Саковічам 74.

Чэцьверць гадзіны пасьля пісар ужо чытаў пратакол—...значнай большасьцяй галасоў аказаўся выбраным на старшыню Янка Дзяцел.

— Гура! радасна закрычэлі Дзятлавы прыяцелі. Земскі, мусіць, віншуючы, падаў Дзятлу руку, той ахвоча сьціскаў земскаму, пакланіўся і так радасна ўсьміхнуўся, ажно канцы яго вусоў падняліся ўгору.

— Падпісвайце пратакол!—сказаў пісар, палажыўшы на краты паперыну і паставіўшы чарнільніцу. Старшыновы хаўрусьнікі сталі падпісваць, а нездаволеныя паадзявалі шапкі і сумныя, павешаўшы насы, выхадзілі на вуліцу. Там сабраліся ў грамадку і ціха гутарылі.

— Ня сталася-б гэдак, каб быў Вяршыла—уздыхнуўшы, сказаў адзін.

— Апрача яго ёсьць пэўных людзей, трэба было толькі згаварыцца загадзя.

— Я-ж і казаў гэта, а вы слухалі гэтых баснябаяў, вось і церабіце цяпер за вухам!

— „Ну, на другі раз не ашукаюць, прахвосты, будзем ведаць“!

— Ня так, то йнакай, але ашукаюць зноў, браткі, нічога не парадзіш, калі за яго стаіць усё начальства. Калі-б мы і выбралі добрага чалавека, які шчыра нас бараніў-бы, то думаеце ён доўга праслужыў-бы? — прагналі б, а то яшчэ пасадзілі-б у вастрог!

— „Праўду ты кажаш. Вяршылу во толькі хацелі яшчэ выбраць і то ўжо пасадзілі“!

— Праўда, то праўда, але што-ж нам рабіць? Так-жа-ж жыць ужо немагчыма, зусум замучылі!

— Трэба, сказаў хлапец гадоў 26 ці, каб на мейсцы старшыні, земскага, станавога і ўсяго, аж да самага верху, начальства, сталі-б нашы, стойкія людзі, тагды толькі можа папрaвіцца наша доля!

— А як-жа ты гэта зробіш, калі вось старшыню й то ня можам зьмяніць? —запыталі ў яго.

— Адзін ня зробіш, але грамада, мільёны працоўных, лёгка гэта зрабіць могуць, трэба толькі дружна нам узяцца за гэту справу, не прадаваць адзін другога, ня грызьціся паміж сабой, як галодныя сабакі за костку і... трэба, каб яшчэ больш нас прыцiснула гора...— неяк быццам саромячыся, дакончыў хлапец сваю гарачую прамову.

У гэты момант выйшлі Дзятлавы сябры і грамадка сялян, убачыўшы іх, хутка растала, а яны, рагочучы, скіраваліся да Шмэркі спрыснуць выбары свайго „дабрадзея“.

Доўга яны там мусіць „прыскалі“, бо-ж і сьцямнела ўжо, а ў мястэчку чуліся яшчэ песьні і выкрыкі п'яных людзей.

П. Асака.

(Канец).

# „Вечар славянскае песьні“.

На „вечар славянскае песьні“, які адбыўся 17/VI у залі Віл. Белар. Гімназіі мела шчасьце лучыць і мая скромная „асоба“, вось, уражаньнямі і думкамі з яго хачу падзяліцца з чытачамі.

Проста, ясна і з пачуцьцём прачытаў сваю прамову праф. Галкоўскі. Яго прыемны голас, энэргія так і ўкладалі ў сьведамасьць чалавека паняцьці аб значэньні народнай песьні, аб яе гістарычным разьвіцьці. Песьня—душа народу! — казаў прафэсар, але адчувалася, што і ў свой рэфэрат ён улажыў частку свае душы, сваіх нэрваў! Ня быў гэта сухі „прафэсарскі“ даклад, або прамова з абавязку, але выходзячая з глыбіні душы патрэба падзяліцца з прысутнымі сваімі думкамі і досьледамі.

Першай была выканана польская частка канцэрту. Польская песьня—паясьняў—праф. Галкоўскі—тварылася ў момант найвялікшага росквіту польскае дзяржаўнасьці, таму польская песьня гучная, вясёлая, поўная „пыхі“ і самапэўнасьці. Добра прапяяў гімназіяльны хор „Мазура“, дасканала грам. Крэчэтаў „Козака“ і дасканальна, як і ўсю праграму вечара, грам. Зубовіч.

Але польская песьня неяк не знаходзіла водкліку ў маёй душы—ня ведаю дзеля якіх прычын. Можа дзеля таго, што нам, беларусам, ня прыходзілася перажываць гэтай дзяржаўнай „пыхі“, можа дзеля таго, што з польскай культурай дасюль мы мелі сутычнасьць толькі ў касьцеле, а можа і яшчэ дзеля якіх шмат бліжэйшых і больш „памацальных“ прычынаў—ня ведаю!

Другімі — расейскія народныя песьні.— Магутная, шырокая, як прастор сьцяпоў і бязьмежных сьнежных раўнін—гаварыў прафэсар—расейская песьня! У ёй выяўляецца дабрадушная, адчыненая душа вялікароса!— Асабліва вялікае ўражаньне зрабіла на мяне вясковая песенка „Душечка девіца“. Гледзячы на грам. Зубовічаву, на яе жэсты, выразы твару і артыстычнае ў поўным значэньні гэтага слова, выкананьне — прадстаўлялася, што бачу ня сцэну, а старадаўні расейскі „терем“ і не артыстку, а дзяўчыну, якая з трапятаньнем і радасьцяй чакае баяр і ў іх ліку свайго любага!

Частка ўкраінская была рэпрэзэнтавана ў параўнаньні з іншымі за-мала. Усяго два, хоць праўда добрыя, „кавалачкі“: 1) частка з „Бандуры“—Давідоўскага і 2) „Чорна хмара над дубравай“, дуэт з опэры „Запорожац за Дунаем“, а ўкраінскае народнае творчаства такое багатае! Украінскія песьні разыходзіліся па ўсей Вялікарасіі і навет трапляюцца да нас на Беларусь. Арыгінальна была выпаўнена частка з „Бандуры“. Хор выпаўняў ролю аркестры, тварыў акампанімэнт для салістаў; мелася ўражаньне, быццам дзесь здалёка—здалёка чутна нейкая райская музыка! Відаць, многа працы і любові да свайго дзела ўлажыў кіраўнік хору грам. Шырма! А як-жа прыгожа і міла выканалі дуэт Аксаны і Андрыя грам. Зубовічава і грам. Арцеменко — сопрано і тэнар. Добра выканала пара танцораў гэты амаль не агульна-славянскі танец — Гапак, была толькі адна маленькая загана. Безшабашны, вясёлы танец — На бок гора—мора па калена!—і гэта выражалася ў рухах, але... не хапала гэтага-ж выражэньня на твары танцораў! Глянуўшы на іх, адчувалася, што быццам не яны выпаўняюць ролю, хоць праўда і вельмі добра. Але гэта дробнасьць—маленькая цень, якая ня прыкметна праляцела. Нарэшце дачакаліся і нашае беларускае часткі. Цікавасьць брала, як наша культура, наша песьня якое яна мейсца займае, ці багата прыгожымі гукамі? — Беларуская народная песьня сумная, хаця беларус і не пазбаўлены гульлівае вясёласьці—чытаў прафэсар. — На яе ўклад паддзеялі геаграфічныя ўмовы жыцьця: лясы, балоты, няўраджайная зямелька і палітычная— вяковая няволя! Так, можам дадаць ад сябе, што

# Тварэньне нямецкага ураду.

### Перагаворы пасла Мюллера з „людоўцамі“.

Пасол Мюллер, якому прэзыдэнт даручыў стварыць урад, вёў перагаворы з „людоўцамі“ Штрэзэмана. Людоўцы паставілі, як варунак свайго ўваходу ў склад ураду, каб аднача сна з стварэньнем агульна-нямецкага ўраду на падставе „вялікай коаліцыі“ (4 партыяў цэнтра-леву) — адбылася на тэй самай падставе і перабудова ўраду у Прусіі, у склад якога ня былі дагэтуль дапушчаны людоўцы.

Сацыял-дэмакратычная фракцыя парляманту аднак-жа адмовілася зрабіць націск на прускага прэм'ера с.-дэм. Брауна — ў кірунку жаданьняў людоўцаў. Але ў канцы абедзьве староны неяк згаварыліся на пэўным кампраміссе, і урад Мюллера створаны быў на падставе „вялікай коаліцыі“, ці — з учасьцем людоўцаў.

### Новы ўрад Нямеччыны.

Перагаворы пас. Мюллера з нямецкімі партыямі закончыліся праектам ураду, у склад якога маюць уваходзіць 4 сацыял-дэмакраты: канцлер Мюллер, мін. унутран. спраў Зэвэрынг, мін. фінансаў Гільфэрдынг і мін. прадавольства Шміт; 3 цэнтроўцы („каталіцкія дэмакраты“) мін. справядлівасьці Герард, мін. Працы—Браўнс і мін. акупаваных абшараў (асоба ня выбрана яшчэ); 3 „людоўцаў“ — мін. заграніч. спраў (нязьменны) Штрэзэман, мін. гаспадаркі Курцыус і мін. поштаў Шэтцель („баварскі людовец“) і 1 „дэмакрат“ — мін. шляхоў і камунікацыі Дытрых. Апрача таго, — беспартыйны мін. дзяржаўнай абароны ген. Грэнэр.

### Выбар прэзыдыуму новага нямецкага парляманту.

14 чэрвеня адбыліся выбары прэзыдыуму нямецкага парляманту. Парлямант быў перапоўнены.—Усе асабліва цікавіліся, ці будзе выбраны, як у прускім Сойме, камуніст віцэ-старшынёй.

На 445 галасаваўшых сацыял-дэмакрат Лебэ атрымаў 313 галасоў — пры 70 устрымаўшыхся. Камуністычны кандытат Тэльман атрымаў 46 галасоў, „гітлеравец“ Фрык — толькі 11.

Першым віцэ-старшынёй выбраны цэнтровец Эсээр (пэўне-ж—не „эс-эр.“), другім—„людовец“— Кардоф, трэцім — нацыяналіст Грэфэ. Такім чынам камуністычны кандыдат быў правалены, ня гледзячы на тое, што група камуністаў у парляманьце—значна перавышае клюб „людоўцаў“.

Пасьля выбараў Рэйхстаг прыняў — без дыскусіі прапазіцыю камуністычнай фракцыі—аб звальненьні з вастрогу камуністычнага пасла Кіпэнбэрга.

### Ізноў перашкоды з боку „людоўцаў“.

У апошні час людоўцы ізноў затрымалі стварэньне ураду, высунуўшы трэбаваньне безадкладнай перабудовы — на аднолькавых падставах—з агульна-нямецкім —і прускага ураду. Сацыял-дэмакраты, якім чамусьці вельмі залежыць на далучэньні да іх ураду гэтай партыі буйнейшай буржуазіі, страшэнна лаюць іх паводле ў сваей прэсе за тое, што яны перашкаджаюць тварэньню ураду.

### Справа амністыі ў Рэйхстагу.

На паседжаньні 15/6 Рэйхстаг займаўся пераважна справай амністыі. Камуністы ўнесьлі прапазіцыю амністыі для ўсіх пралетарскіх палітычных вязьняў — з выключэньнем забіўцаў-самасудцаў з „Чорнага Рэйхсвэру“. З другога боку нацыяналісты ды гітлераўцы, па якіх была прапазіцыя камуністаў, уняслі прапазіцыю, каб выключыць з амністыі ўсіх, засуджаных за шпіёнства, здраду ваенных тайнаў ды за праступленьні, дакананыя з матываў зыску. Зразумела, што дыскусія над справай выклікала страшэнна гарачыя настроі сярод паслоў, асабліва на абодвух крайніх флангах.

Буру гневу выклікала прамова нацыяналістычнага пасла, які назваў палітычныя забойства „Чорнага Рэйхсвэру“—„актамі нацыянальнай самаабароны проці дзяржаўных здраднікаў“. Аднак-жа, ня трацячы „гумару“, нацыяналіст „дадаў жару“ ў канцы, патрэбаваўшы, каб парлямант... выразіў нашаму любоў, ды чэсьць былому імпэратару Вільгэльму — ў зьвязку з 40-вымі ўгодкамі яго ўступленьня на трон...

Усе прапазіцыі пераданы ў камісію.

# Заграніцай.

### Вострая прамова украінскага прэм'ера Чубара.

Як падае „ПАТ“, старшыня Рады Нар. Каміс. Радавай Украіны Чубар сказаў у Харкаве прамову, вельмі востра скіраваную проці Польшчы, проці польска-румынскага саюзу ды наагул проці ўсей міжнародавай палітыкі заходніх дзяржаў, скіраванай проці СССР. Палітыка гэта, казаў Чубар, цалком залежная ад пазычаных гэтым дзяржавам даляраў ды фунтаў.

### „Рабочая газэта“ аб польска-літоўскім споры.

„Рабочая Газэта“ востра крытыкуе рэзалюцыю Рады Лігі Нацыяў у справе польска-літоўскага спору, заяўляючы, што ўсе сымпатыі СССР—на старане Літвы.

### „Ілжывы артыкул“.

Пад такім загалоўкам падае „Кур. Варш.“ тэлеграму з Лёндану такога зьместу: „Газэта „Манчэстэр Гвардыян“ зьмясьціла доўгую перадавіцу, яўна інсьпіраваную камуністамі, якая нязвыкла востра выступае ў абароне беларускай і украінскай меншасьцяў, якія быццам жывуць у Польшчы пад сталым тэрорам. Артыкул параўноўвае з гэтым палажэньнем добрыя варункі існаваньня для тых-жа меншасьцяў у СССР. Гэты ілжывы артыкул ідзе так далёка, што перасьцерагае Польшчу перад магчымасьцю выбуху рэвалюцыі з боку ўпаўшага у адчай насяленьня“.

Дзіўным толькі выдаецца тутака гэтая „камуністычная інсьпірацыя“ ў газэце, якая, здаецца, дагэтуль лічылася баявым органам англійскіх лібэралаў.

### Алярмуючыя інфармацыі радавага пасла ў Парыжы.

Радавы пасол у Парыжы Доўгалеўскі, як даведаўся карэсп. „Кур. Варш.“, паведаміў Радавы ўрад — аб энэргічнай агітацыі англійскай дыпляматыі проці Радаў—асабліва ў Нямеччыне. Англійская агітацыя карыстаецца справай нямецкіх інжэнэраў у СССР.

### Бурны дзень у новым француcкім парляманьце.

14./VI. новы француcкі парлямант у першы раз галасаваў у палітычнай справе. Хаця ў канцы ўрадавая большасьць перамагла, але апазіцыя дала першы бой ураду. Сацыялістычны пасол Юры ізноў унёс прапазіцыю аб звальненьні паслоў—камуністаў, ужо адкінутую раз папярэднім урадам. Прапазіцыя гэта дала магчымасьць выступіць проці ўраду ўсім злучыўшымся сілам апазіцыі: сацыялістам, камуністам, эльзаскім аўтанамістам і г. д. Аўтанаміст Вальтэр скарыстаў з аказіі, каб востра скрытыкаваць прысуд суда ў кольмарскім працэсе эльзаскіх аўтанам., дамагаючыся скасаваньня прысуду.

Галасаваньне прапазіцыяў дало ўраду большасьць галасоў у 342 проці 167.

Да гэтага цікаўнага паседжаньня трэба будзе яшчэ вярнуцца — пасьля атрыманьня падрабнейшай справаздачы.

### „Сяродземна-марское Лёкарно“.

Румынская прэса падае сэнсацыйную вестку—аб новым звароце ў справе італьянска-югаслаўскага спору з-за ўплываў на Балканах і на Адрыятыцкім моры. Быццам—пад згодным націскам паразумеўшыхся Амэрыкі, Англіі і Францыі—Італія згадзілася прыняць учасьце ў рэалізацыі вялікай пазыкі для Югаславіі. Пачын гэтай думкі дый сіла націску ідзе з боку амэрыканскіх і англійскіх фінансістаў, папросту—банкіраў. Пазыка мае быць падзелена пароўну між Амэрыкай, Англіяй, Францыяй і Італіяй. Гэтая пазыка мае быць уступным крокам да так-званага „Адрыятыцкага Лёкарно“, гарантуючага мір на Адрыятыцкім моры.

### Літоўска-нямецкія нарады.

У Коўну прыехаў сябра нямецкай гаспадарчай дэлегацыі—для нарады з урадам у справе ўзаемных эканамічных адносінаў. Нарада адбылася ў прысутнасьці літоўскага пасла ў Бэрліне і сэкрэтара мін. загран. спраў.

### Ваяўнічыя прамовы Вальдэмараса і яго ваеннага міністра—на зьезьдзе шаўлісаў у Коўне.

Мясцовая віленская прэса падае вестку аб адбыўшымся ў нядзелю і панядзелак у Коўні зьезьдзе літоўскіх шаўлісаў (стральцоў). На зьезьдзе выступілі з прамовамі Вальдэмарас і яго ваенны мініст. Даўкштас.

Вальдэмарас даў агляд ходу польска-літоўскай справы на апошняй сэсіі Рады Лігі, падчыркнуўшы, што вялікія дзяржавы хочуць, як відаць, змусіць Літву пагадзіцца з Польшчай. Аднак-жа літоўскі ўрад бароніць ды будзе бараніць інтарэсы Літвы да апошняга.

Ваенны міністар, сцьвярдзіўшы, што справа Радай Лігі адложана на восень, заявіў, што—дагэтуль яшчэ ня можна прадбачыць, ці польска-літоўскі спор будзе вырашаны мірна, ці—сілай аружжа. Сваю прамову мін. Даўкштас закончыў выкрыкам: „пераможам, або—ляжам на полі бою“...

# С О Н.

Што за ліха? Хіба сон...
Чую шум лёкаматывы,
У машыны звон
Заслухаліся нівы.
Працоўны ніва і прастор,
Варштаты прыцы
Слухаюць натор.
Абшары панскія, палацы
Дзе?!
Няма. Зямля належа
Працоўнай грамадзе.
Зямлю плуг рэжа,
Разьмягчае
Мэханічна;
Трактар, жнівярка сьпявае,
Аб новых днёх сьпяваюць зычна.
Льецца гоман, сьмех вясёлы.
Гляджу, палацы...
Ага! дык гэта школы,
Школы працы.
Гляджу, дзівуюся, ня знаю,
Ня можа быць! Ці гэта ты, мой родны край?
Ці-ж так ужо жывецца Беларусі сыну?
Няўжо я бачу калектыўную, агромную
[машыну?

Ці-ж гэта можа быці сон?
„Ці вольныя ўжо вы“! —
Крычу людзём,
Адказ: „Так вольныя ўжо мы“!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ах!...
Гэта толькі сон.
Зноў жах,
Зноў чую я праклён.
Навокал цьма,
Нічога як няма, так і няма.
Сярмяга. Селянін,—
Нядолі сну
Кляне, пануківае сіўку,
Гарэ вузенькую істужку ніўку.

А. Б.

### Градавая бура ў Люблiншчыне.

Над Замайскім і Грубешаўскім паветамі прайшла вялікая градавая бура, зьнішчыўшая пасевы амаль ня ўпоўнасьці.

### Забастоўка ў фабрыцы аэрапляпаў ў Любліне.

У фабрыцы аэрапляпаў Пляге і Ляскевіч забаставалі лякернікі і сталяры. Бастуючыя дамагаюцца 100 прац. падвышкі платы.

### Жаданьні Лодзкіх работнікаў.

На апошнім паседжаньні прафэсыянальнага саюзу работнікаў у Лодзі пастаноўлена выступіць да прамыслоўцаў з наступнымі жаданьнямі: павялічэньня 15 прац. платы трыкатовым работнікам, пашанаваньня ва ўсіх фабрыках сацыяльных законаў, платы за перарывы з прычыны папраўкі машын ці недастарчэньня фірмай матэр'ялу для прадукцыі і прызнаньня работніцкіх дэлегатаў.

Адначасна з гэтым работнікі адмовілі прызнаць ўмову мінуўшага году.

### Работніцкая дэманстрацыя ў Кракаве.

У справе прадаўжаючайся забастоўкі кракаўскіх будаўляных і драўняных работнікаў (трэба зазначыць, што бастуе больш 6000 работнікаў) прафэсыянальны саюз работнікаў з'арганізаваў дэманстрацыйнае веча з паходам. У часе веча, некалькі камуністаў, паводле „Rzeplita“ ў 172 нумары, прабавалі выклікаць „забурэньні“.

### Забастоўка ў Сувалках.

У лесапілцы Плацічна забастовала 140 рабатнікаў, з прычыны нявыплачваньня ім заработку.

### Забастоўка будаўляных работнікаў у Быдгошчы.

У Быдгошчы пачалася забастоўка будаўляных работнікаў, якія жадаюць павялічэньня платы.

---

нам гвалтам прышчэпленая чужая культура, але беларускі народ вынослівы, цярплівы! Пры тых умовах і страшэнным наплыве чужацкае культуры, трэба было мець надзвычайнае гэройства, жывучасьць, каб захаваць у такой чыстаце і прыгожасьці сваю родную песьню!

Пяе хор „Зялёны дубочак“, „Цёмна ночанька“, „Ці сьвет ці сьвітае“. Льюцца такія блізкія, родныя гукі! Усе жылкі нэрваў, самыя таемныя куточкі душы задрыжэлі, адзываюцца і ловяць, упіваюцца імі! „Гарні бульбу з печы“—полька. Гэта-ж знаёмы, мілы абразок, калі і беларус разгуляецца, весяліцца, хоць і пяе аб сваей „бульбе“—чым жыве, аб тым і пяе, — але весела! Так і падымае, так і хочацца „скінуць боты, скінуць лапці“ і... „часануць“ у скокі! Забыцца, утапіць у іх сваё гора! „Народная калыханка“ — пяе грам. Шырмава — успамінаюцца дзяцінныя годы, матка. Як-раз гэтак, думаеш, яна, бедная, прыйшоўшы з поля, змучаная цяжкай працай, калыхала і пяяла нада мной:—„А-а! а! Не хадзі кот на пе-э-чы“!—Адгукнулася душа, ня толькі слухае, але пяе разам з хорам, з артыстамі, пяе тая, што калісь пяяла бабка, прабабка, дзед, прапрадзед, — знайшло гэта ў ёй водгук, пачула свой родны голас! Паляцеў прэч увесь чужацкі накіп, і рассыпалася тое, што вякамі ўсё-ж такі пасьпелі нам прышчапіць, і я зразумеў, што я косьць ад косьці беларус—сын свайго народу. Беларус, беларус!!—аб гэтым гавора мне кожная жылка, уся мая істота і ўжо цяпер ніякая сіла ня зможа выкараніць, заглушыць гэтага пачуцьця!

Вось і творы і нашых вялікіх песьняроў-паэтаў—у музыкальных гуках!.. Г-ка Зубовічава пяе з хорам „Устань ты, старонка“, пад музыку п. Галкоўскага, вершык К. Буйлы „Адна“. Сумуе дзяўчына па здрадзіўшым яе каханку, прыгаварвае да ветру, знаходзючы ў ім сваяцтва ў сучасных сваіх перажываньнях. Так, як ён ня знае ніколі супакою: ляціць, гудзіць, жаласна стогне ў каміне, так і яе душа ў гэты момант не супакойная, — плача, стогне! А колькі кожнаму з нас прыходзіцца перажываць падобных хвілінаў? Дуэт г-кі Шырмавай і Зубовічавай — „Тры сыны“—словы Купалы і апошняя песьня „Месяц“, у якой адбіваецца выразна наша сучасная народная трагэдыя.

„Кінь ты жальбу нашу ў неба“!

Раскажы, „як бяз хлеба і бяз долі працавіты люд наш гнецца“!

Гаворыцца ў песьні, дарэмны кліч, бескарысная просьба! Не ўзварушаць яго нашы просьбы — сьлёзы — ён усьмяхаецца толькі з высокага неба!..

Мы маем чатыры новых музыкальных творы да слоў нашых паэтаў — кампазытара Галкоўскага.

Закончылася нашымі нацыянальн. танцамі—усім ведамай „Лявоніхай і Юркам“.

Бедны Юрка! Адзін круціцца, прысядае перад весела танцуючымі парамі, цягаюць яго за чуб!

Юрка—гэта, створаны народам сымболь яго жыцьця. Ці-ж ня так-сама дасюль танцаваў бядняк—мужык, гнуўся, у тры дугі, перад вясёлымі, сытымі валадарамі нашае старонкі?!

Ці-ж мала яму даставалася за чуб і па чубу?!

Але мінаюцца тыя гады, што камусь упіраліся ў бокі! Няма ўжо Юркі—цёмнага, пакорнага, паразумнеў—навучыла гора,—бяда! Стаўся сьвядомым сваіх правоў чалавекам і ўжо больш не пазволе цягаць сябе за чуб! Канец. Воплескам і крыкам брава!!! біс!!! здавалася, ня будзе канца. Усхапянуліся разыходзіцца, аж раптам зайграў вучнёўскі аркестр наш народны гімн! Усе прысутныя, як укопаныя, застанавіліся і з сотняў грудзей, быццам па камандзе, палілося „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі“!? — Грымелі гукі, як хвалі разыйшоўшагася мора, поўныя пачуцьця сілы і... перасьцярогі па адрасу вясёлых, сытых!—Мы доўга цярпелі—цярпець больш ня будзем!..—і... раптам аркеста абарвала — заціхла. Хтось яшчэ зацягнуў, але схамянуўся—прыціх.—Што ж гэта такое?—думаў я. Хто ж гэта адкусіў хвост — канец нашага гімну?!

Пасьля гэтае вечарыны чуўся быццам, як кажуць, толькі-што на сьвет нарадзіўся! Пачуў у сабе прыліў сілы, энэргіі і веры ў тое, што хутка загляне сонца і ў наша ваконца! Вялікае дзякуй, дзякуй і яшчэ раз дзякуй кампазытару, і артыстам, і гімназіяльнаму хору, і аркестру і грам. Васілеўскаму, які так прыгожа намаляваў дэкарацыі і ўсім, усім, хто прылажыў сваю руку і працу дзеля яе зарганізаваньня!

— Сейце разумнае, добрае, вечнае!...— Будзіце заспаных, падмацоўвайце прыслабеўшых у барацьбе, загаварэце да сумленьня заблудзіўшых на чужыя, варожыя нам шляхі!..—Скажа Вам дзякуй, сардэчнае дзякуй, наш Беларускі народ! А якая-ж можа быць большая нагарода, як ні гэтае „сардэчнае дзякуй! Што значаць у параўнаньні з ім злоты, даляры? Жыцьцё хвілька — памрэш і... ўсё скончыцца разам з табой! А добрая памяць, „сардэчнае дзякуй“ жыве сотні, тысячы гадоў!

Пажадана было-б, каб такія вечарыны адбываліся часьцей, пэрыядычна. Мне ажна дзіўна робіцца, чаму мы беларусы ня маем сталага свайго тэатру?! Прыдуць якіясь расейцы, плоцяць за памешканьне і гуляюць! Валяць туды і беларусы — некуды дзецца! Быў раз і я на гэдакім прадстаўленьні. Чакаў гадзіны дзьве і нарэшце ўбачыў нейкіх, чуць ня голых жанчын, і наагул рэч пустую, нікчэмную з жыцьця перасычанай, распуснай буржуазіі. Плюнуў і выйшаў я адтуль.

А мы, беларусы, маючы свае, на пачатак даволі добрае, памешканьне, свой аркестр, хор—ня ўмеем ці ня хочам гэтага выкарыстаць, плачам толькі, наракаем, што мы бедныя, няма скуль узяць грошы на асьветную працу, гімназію, прытулак! Пад ляжачую калоду вада не цячэ—кажа народная прыказка. Ці можа ў нас бракуе артыстычных сілаў? Гэтаму не паверу!

Знайшліся-ж, вось на гэты вечар! Ды і што гаварыць! У шмат якіх вёсках ужо выробіліся сцэнічныя сілы, што і ў добры тэатр ня стыдаліся-б паказацца, а ў Вільні, сярод інтэлігенцыі, ды каб іх ня было? Есьць! Але... Вось гэта але, каб яго ліха, шмат перашкаджае. У некаторых шчырых працаўнікоў заўважваецца пад уплывам жорсткіх рэпрэсіяў і бесканечных перасьледаваньняў — упадак духу, энэргіі. Дзяржэцеся браты! Часьцей такія вечарыны арганізуйце—паднімемся! Іншага выхаду няма, калі ня хочам ісьці на чужым павадку і навольна канаць душой!.. А многія ўжо спусьціліся на „дно“! Танцуюць пад чужую дудачку „Мазура“, твораць нейкія крамкі з гнілым таварам, хварэюць на манію вялікіх людзей „павадыроў“—сьпіліся, і што-ж далей! Павыкідае іх гісторыя, калі не паправяцца, пакуль яшчэ час, на сьметнік жыцьця, ды там і загінуць яны з пазорным імем—здраднікаў. Ува ўсіх павінна быць адна мэта — гэта Беларусь, у якой ня чулася-б стогнаў працоўных, абяздоленых!..

Адзін з прысутных.

Ад Рэдакцыі: Як ведама Рэдакцыі, надзвычайную энэргію пры арганізацыі вечара праявіў Дырэктар Віл. Бел. Гімназіі грам. Паўловіч. Ён настойчава і тактоўна йшоў да свае мэты і калі згадзіцца, што гэны „вечар“ зрабіў пераварот у гісторыі беларускае песьні, то наш паважаны Дырэктар, як як-раз і зьяўляецца тым, хто ў значнай меры разам з другімі прылажыўся да гэтага „перавароту“.

# Наша хроніка.

**Новы суд проці гр. Астроўскага.** На 28 г. месяца вызначана ў Віленскім Акружным Судзе справа проці былога дырэктара Віленскай Беларускай Гімназіі грам. Астроўскага. Грам. Астроўскага абвінавачваюць ў апоры прадстаўнікам ўлады, якія ў 1925 годзе займалі частку будынку, дзе месьціцца Гімназія. Суд патрывае 1 дзень.

**„Сялянская Ніва“ ў старой ролі даношчыкаў.** „Сял. Ніва“ ў апошнім нумары пачала зноў мілую ёй з даўных часоў лаянку на бел. радыкальную прэсу і на прадстаўнікоў гэтае-ж думкі. Красачкай гэтага зьявіліся дзьве хранікёрскія заметкі — „Учадзеўшая рэдакцыя“ і „Паслы на службе ў пэпээаў“. У першай выказваецца незадаваленьне, што ня зьмешчана абвестка аб выхадзе ў сьвет „Сымона Музыкі“ Я. Коласа, выд., здаецца, фірмы „Пагоня“. Да гэтага факту „Сял. Ніва“ прычапіла, што „рэдакцыя выслугоўваецца чужацкім інтарэсам“, „сама па сваім перакананьням (вось дзе граматнасьць сельсавецкіх пісакаў!) не зьяўляецца беларускаю“, „учадзела партыйнай грызьнёй і ненавісьцяй да беларусаў“... У другой—лае пасла Гаўрыліка і Валынца, што яны па запрашэньню пэпээс-лявіцы рабілі справаздаўчы мітынг для работнікаў м. Вільні.

Хіба толькі брак разьвіцьця ды навет здаровага розуму ў кіраўнікоў „Сял. Нівы“ робяць магчымымі зьмяшчэньне падобных заметак, якія зводзяць „Сял. Ніву“ да ролі бруковых газэтаў. Як — быццам мы павінны зьмяшчаць абвесткі гандлёвае фірмы, хоцьбы нацыянальна-беларускай, аб чым да таго-ж не дасталі навет паведамленьня, а паслы сялянска-работніцкага клюбу адмовіцца ад запрошаньня зрабіць мітынг для работнікаў, значную частку якіх да таго-ж складаюць беларусы. Ці можа другі раз пытацца ў рэдакцыі „Сял. Нівы“—дзе рабіць мітынгі?

Робіцца ўражаньне, што пісаў гэтыя заметкі якісь смаркач, якога сьветапагляд не сягае далей свайго сьметніку. Але яны робяць не малую чэсьць і запраўдным кіраўнікам „Сял. Нівы“. Ня варта такім і адказваць па сутнасьці.

**У справе прывітаньня праскага студэнства.** Згодна надыйшоўшых новых дакумэнтаў—прывітаньне, аб якім падавалася ў папярэднім нумары, падпісала ня толькі паступовае студэнства, а ўсё беларускае студэнства ў Празе, за вельмі малымі выняткамі (двох-трох трусоў, якія, відаць, баяцца „папсуць сабе апінію“ перад прыездам у край).

Згодна подпісаў, у Празе лічыцца яшчэ каля 50 студэнтаў-беларусаў. Некаторыя ўжо прыедуць зараз дамоў, а найбольшая частка—канчае вышэйшыя школы наступнаю зімою.

**Арыштаваньне камуністычнага „тэхніка“.** У цягніку, йдучым з Вільні ў Варшаву, арыштаваны, паводле газэтаў, камуністычны „тэхнік“ нехта Лоў. У часе рэвізіі ў яго быццам знойдзена 130 камуністычных адозваў з выпісанымі „пратэстамі“ проці прысуду над „Грамадой“.

**Вялікая шпікоўская арганізацыя ў Беласточчыне.** Газэты падаюць, што ў Беласточчыне (Граева) арыштавана 13 чалавек вялікай шпікоўскай арганізацыі, якая займалася шпікоўствам на карысьць аж 3 суседніх дзяржаваў. Газэты падаюць проста рэвэляцыйную вестку: што гэтая арганізацыя, апрача шпікоўства ў Польшчы, займалася шпікоўствам і ў Усходняй Прусіі.

# З Т-ва Бел. Школы.

### З працы Гурткоў Т-ва Бел. Школы.

× Блудзенькім гуртком Т-ва Бел. Школы быў адыгран спэктакль 9 студня г. г. ў вёсцы Блудзень. Ставілі п'есу „Пан Міністар“.

29 студня г. г. ставілі сп. ў месьце Бяроза-Картузкая. Адыгралі п'есу: „Пан Міністар“.

19 лютага г. г. ставілі сп. ў вёсцы Бармуты, Равячанскай гміны—адыгралі п'есы: „Міхалка“, „Зьбянтэжаны Саўка“ і „Заручыны Паўлінкі“.

× 22 красавіка быў наладжаны вечар-спэктакль. Былі згуляны п'есы: „Паўлінка“ і „Заручыны Паўлінкі“. Ставілі ў шопе стражы агнёвай ў Блудне, каторую сваімі ўласнымі сіламі і наладзілі пад спэктакль, выбудавалі сцэну і лаўкі. Народу зыйшлося з усіх канцоў. Шмат пашло дамоў, бо ў шопе ня было месца зьмясьціцца.

Чысты даход пайшоў на-палове з стражай агнёвай, а наша палова пайшла на культурныя мэты.

× 27 траўня быў наладжаны спэктакль-вечарына. Былі пастаўлены п'есы: „Боты“ ў 1 акце і „Суд“ ў 1 акце.

Ня гледзячы на дождж, народу сабралося многа і кожны задаволіўся тым, што быў на спэктаклі.

Чысты даход пайшоў: 22 зл. 05 гр. на карысьць стражы агнёвай ў Блудне, а рэшта: 33 зл. 08 гр. на карысьць бібліятэкі-чытальні ў Блудне і 10 зл. адасланы ў Галоўную Управу на выданьне—новых п'ес.

Чэсьць Вам, Блудзенькія артысты, што замест таго, каб напіцца гарэлкі ды разьбіваць галовы, ды падымаць авантуры на вёсцы, (як гэта водзіцца ў многіх іншых вёсках) змагаецеся з цемрай—адвечным ворагам беларускага селяніна і работніка.

× У нядзелю, 3 чэрвеня б. г., Баранавіцкім Г-ком Т-ва Бел. Школы была наладжана вечарына-спэктакль. Гулялі камэдыю „Шчасьлівы муж“. Ня гледзячы на тое, што ў той самы дзень адбываўся спэктакль расейскі, саля беларускага тэатру была перапоўнена. Пасьля спэктаклю былі скокі да 4 ай гадз. раніцы.

У нядзелю 17 чэрвеня ў тым-жа Гуртку адбыўся рэфэрат для сяброў Г-ка на тэму: „Этыка“. А. Н.

× Усьцеўскім Г-ком Т-ва Бел. Школы былі наладжаны 3 спэктаклі ў вёсках: Крываногава, Трасьцяніцы і Усьцеўшчыне. Усе спэктаклі прайшлі добра, ня гледзячы на тое, што некаторыя жаноцкія ролі адыгралі хлапцы. Згулялі гэткія п'есы: 1) „Зьбянтэжаны Саўка“, 2) „Пасланец“, 3) „Суд“ і 4) „Боты“. У арганізацыі Гуртка Т-ва шмат зрабіў вучань скончыўшы Нав. Бел. Гімназію, за што яму вялікая падзяка.

В. Чаромха..

# З Радавае Беларусі.

### „У Менскай і Полацкай акругох бальшавікі будуюць фарты“.

Пад такім загалоўкам „Kur. Wil.“ у 132 нумары падае вестку аб тым, што бальшавікі ўжо ад „dłuższego czasu“ будуюць у гэтых акругох фарты (ваенныя ўкрапленьні).

× „Звезда“ паведамляе, што этнограф Сорбаў падгатаўляе навуковую экспэдыцыю на раку Ухлясьць, Магілёўскай акругі, дзеля досьледаў межаў рассяленьня „Дрыгавічоў і Радзімічаў“.

× „Я. Дыла апрацоўвае для кіна-тэатру сцэнарый на тэму: „З пад ярма“. А Ляшкевіч піша для кіна п'есу, па повесьці Якуба Коласа „На прасторы жыцьця“.

× „У Дзяржаўны Беларускі Музэй у Менску прысланы з Разані багатыя калекцыі былога архэалягічнага музэю, вывезенага з Менску ў Разань у 1915 годзе“.

× „Па афіцыяльных данных, у Менску налічваецца 135,000 жыхароў. Прамысловых прадпрыемстваў і майстроўняў—2.486“.

× „Беларускі Сель-банк адпусьціў 200 тыс. руб. крэдыту на будаваньне агнятрвалых будынкаў у Усходняй Беларусі“.

# Паштовая скрынка.

**Прысутнаму беларусу.** З вашай пісулькі мы ня можам нічога выкарыстаць, бо пішаце вельмі нявыразна.—**„Бому“.** Зьмесьцім у бліжэйшым нумары. Вы маеце здольнасьць пісаць, дык ня губіце яе, а пішыце далей.—**Падпішчыку № 6595.** Вы вельмі ня выразна напісалі, так што скарыстаць ня можам. Калі хочаце, каб карэспандэнцыя аб зьдзеках над вамі пагранічнікаў надрукавалася, напішыце яшчэ раз, але выразна, падаючы ясныя факты—тагды зьмесьцім.









# Карэспандэнцыі.

### Памажэм пацярпеўшаму!

(В. Сычавічы, Радашкаўскай воласьці, Маладэчанскага павету).

У дзень 9-га мая г. г. прышлося пацярпець нашай вёсцы нешчасьлівае здарэньне: гэта буру, якая нясласяся з вялікай сілай, ломячы ўсё па дарозе, як: лясы, прысады хаты і інш. Асабліва пацярпела вёска Сычавічы. У дзень 15-га мая ў гэткай-жа вёсцы мела мейсца другое няшчасьце: здарыўся пажар, які зьнішчыў усю сялібу Фэлькі Зялёнкі. Трудны цяпер стан яго жыцьця, пагарэла ўсё як: адзежа, рознае дабро, сена і няма нічога ні сабе, ні сеяць, ні навет даць каню есьці. Вёска Сычавічы складаецца памагчы беднаму пагарэўшаму. Хацелася-б, каб і ўсе суседнія вёскі памаглі. Пара ўжо кінуць аддаваць грошы на дзінатур і піць яго, а, хто мае лішнія, лепш скласьці і даць помач беднаму пагарэльцу. Сычавец.

### Пара апомніцца.

(В. Вітараж. Косаўшчына).

У 27 годзе некаторыя хлапцы пажадалі выпісаць беларускую газэту і кніжак у Вільні, на што пачалі зьбіраць складку. Панскі падлізьнік Аркадзі Касенчук данёс аб гэтым паліцыі, якая напісала пратакол на зборшчыкаў, з якіх Кіріла Нiканюк заплаціў кары 50 злотых. Ці не пара апомніцца гэтакім, як Ар. Касенчук? Блізкі.

### За кратамі.

(Грудзёндз).

Калі мы прыехалі ў турму, дык першым абавязкам нашых „апякуноў“ было скампраметаваць нас у вачох тутэйшых нашых таварышоў лёсу, не дапусьціць да салідарнага жыцьця, дзеля гэтага нас звалі „бальшавікамі“ ды абходзіліся зусім не палюдзку. Аднак, гэтыя стараньні нічога не памаглі. Работніцкая салідарнасьць—хоць і ў вастрозе—моцная, як сталь. Доказам гэтага зьяўляецца сьвяткаваньне міжнароднага рабоча-сялянск. сьвята 1-га мая, якое правялі мы пратэстуючы проці эксплёатацыі вязьняў. На наш кліч 30-га сакавіка ўвечары з усіх варштатаў па некалькі чалавек забіралі свае рэчы і міскі і адважна казалі дазорцам, што заўтра будуць сьвяткаваць. Як-жа міла і прыгожа было 1-га мая! Ніхто ня выканаў распараджэньня начальства: не пайшлі працаваць і ня скінулі чырвоных значкоў.

Затое на другі дзень было трохі горай. Кожны можа дагадацца. Але нічога, усё перажывем.

Вельмі дрэнна, што пакараных таварышоў пазбавілі газэт.

Усё-ж духам не падаем, да ўсяго прывыкаем. А. Сініца.

### Новыя „апякуны“.

(в. Азіраўцы, Браслаўскага пав.).

Браслаўшчына не пасьпела яшчэ вызваліцца зусім ад „апекі“ з боку „Вызваленьня“, як ужо зьяўляюцца новыя „апякуны“ ў асобе „Stronnictwa Chłopskiego. Як доказ гэтага, нядаўна я атрымаў (ды пэўне-ж і не адзін я) 2 нумары „okazowe“ „Gazety Chłopskiej“ і пісьмо ад „głównego zarządu Stronnictwa Chłopskiego“, у якім, гэтыя новыя „апякуны, пальнуўшы па майму адрасу некалькі пахлебных кампліментаў, прапануюць мне, „głosić“ іхнюю „ideę“ і „uświadamiać klasowo braci chopów“.

Але, я не хачу быць настолькі бязглуздым, каб яшчэ падаваць паперку, для... пэўнага ўжытку, тым, хто смуродзіць у маей хаце! І думаю, што і ўсе браты сяляне ня будуць верыць гэтым найвялікшым ворогам нашым. Яны горш ад манархістых, бо апошнія, хоць і ваўкі, але воўкі ў сваей натуральнай скуры, а тыя дык зьяўляюцца ваўкамі ў чужой авечай скуры, якіх мы, сяляне, павінны вельмі сьцерагчыся. В. Д—ч.

**Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!**

Рэдактар-Выдавец: Ал. Рудзінскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.